**НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ**

# ПЯТАЯ, ШМАТПАКУТНАЯ…

**Віншуем з выхадам новай кнігі нашу калегу па СПБ, таленавітую беларускую пісьменніцу, вядомую  і паважаную ва ўсёй краіне журналістку Ніну Аляксееўну Рыбік. Кніга атрымала назву «Праз гады і газетныя старонкі». Выданне прымеркавана да 80-годдзя «Астравецкай праўды» і прысвячаецца гэтай газеце, з якой цесна звязана прафесійнае і творчае жыццё Ніны Аляксееўны. Вось, як сама аўтар у сацыяльных сетках выказалася аб навінцы і працы над ёй.** ***(Прэс-служба СПБ-Гродна).***




***

Адной з прычын, па якой я ў 2019 годзе пакінула рэдактарскую пасаду, стала жаданне сістэматызаваць гісторыю «Астравецкай праўды». Да адвечнай незадаволенасці, што мы пішам пра ўсё і ўсіх і вельмі мала ведаем пра сябе, аднойчы дадалося ўсведамленне, што калі гэта не зраблю я, то, напэўна, не зробіць ужо ніхто.

Але, калі я бралася за аднаўленне гісторыі «Астравецкай праўды», то саманадзейна лічыла, што гэта будзе не вельмі цяжка: мінула ж усяго 80 гадоў з выхаду першага нумара! І хоць архівы ў рэдакцыі захоўваюцца толькі з 1965 года, а падшыўкі газет – з 1969-га, была ўпэўнена, што недзе ж ёсць дакументы – у раённым, занальным, цэнтральным архівах, у Нацыянальнай бібліятэцы ці Кніжнай палаце. У рэшце рэшт, гугл мне ў дапамогу!

…Гугл расчараваў першым. Я зрабіла адкрыццё, што ён ведае толькі тое, што нехта яму «паведаміў» і падзяліцца можа толькі тым, чым нехта некалі падзяліўся з ім. А калі тэма такая вузкая і

спецыфічная, за якую ўзялася я, то – на жаль…
І ў архівах знайшлося далёка не ўсё: відаць, з іх папаўненнем у ранейшыя часы існавалі праблемы.
Шмат дапамагла Нацыянальная біблітэка, дзе я «перагапаціла» ўсе падшыўкі, пачынаючы з 1945 года – але і там знайшлося далёка не ўсё.
Часам адольвала роспач: не спраўлюся! Але калі ўсплывала невядомае раней імя, дакумент, дата, знаходзіліся звесткі, адшукаць якія нават не марылася, – гэтая радасць надавала імпэту працаваць далей, капаць глыбей, шукаць, пытаць… Мне шмат дапамагалі – калегі, былыя супрацоўнікі, выпадковыя знаёмыя, блізкія маіх сяброў.
Тыдні камандзіровак… Гадзіны тэлефонных размоў… Дзясяткі сустрэч… Незлічоная колькасць дакументаў і газет… Пытанні, просьбы, запыты, інтэрв'ю… Часам мне здавалася, што я – следчы, які спрабуе аднавіць справы даўно мінулых дзён.
І ўрэшце – вось яно, маё выпакутаванае дзіцятка: першая частка кнігі «Праз гады і газетныя старонкі», у якой размова ідзе пра савецкі перыяд гісторыі газеты. Днямі яно нарадзілася ў Лідскай друкарні.
(Другая частка, у якой размова пойдзе пра «Астравецкую праўду» перыяду незалежнай Беларусі, яшчэ толькі расце і дужэе ва ўлонні персанальнага камп'ютара).
Спытаеце, якія ў мяне адчуванні? Ну, прыкладна, як у парадзіхі, якую нарэшце адпусціў боль, і ёй паклалі на жывот загорнуты ў пялюшкі чырвонатвары камячок абсалютнага, бязмежнага шчасця! Так, цяпер яно не такое вострае, як у жніўні 2000-га, калі ўбачыла ў ларку «Саюздруку» сваю першую кніжку апавяданняў «Права на адсяленне». Але ж нелюбімых дзяцей не бывае!

**Ніна РЫБІК**



**Ніна Рыбік.** ***Пра аўтара***

***www.pisateli.by***